# БІТВА НА СІНІХ ВОДАХ
# У БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫЯГРАФІІ



**Мікалай ЛІННІК,**
*краявед, адказны сакратар «Грамадскага камітэту «Вялікая Літва – гістарычная памяць Беларусі»*

***Светлай памяці***
***Міколы Іванавіча Ермаловіча***

*«Калі мы не падымемся самі –*
*нас не падыме ніхто».*
У. С. Караткевіч

Звесткі аб бітве на Сініх Водах у гістарыяграфіі цікавыя і паказальныя. Іх агляд яскрава сведчыць пра пазіцыі гісторыкаў, час, у якім яны жылі і чые інтарэсы абгрунтоўвалі.

Яна не ўпамінаецца ў:

– «Чтениях по истории западной России» М. В. Каяловіча, выдадзеных у Пецярбургу ў 1894 годзе;

– «Россия. Полное географическое описание нашего отечества. Настольная и дорожная книга для русских людей» под ред. В. П. Семенова. Том 9. Верхнее Поднепровье и Белоруссия», СПб., изд-во А. Ф. Девриена, 1905 г.;

– «Кароткай гісторыі Беларусі» Вацлава Юстынавіча Ластоўскага, выдадзенай у Вільні ў 1910 г.

У савецкі перыяд не даюць звестак пра гэтую бітву:

– другое выданне «Большой Советской энциклопедии», выдадзенай у сярэдзіне шасцідзесятых гадоў у Маскве;

– «Энциклопедический словарь», выдадзены ў Маскве ў 1964 г.;

– пяцітомная «Гісторыя Беларускай ССР», выдадзеная ў Менску ў 1972 г.;

– пяцітомная энцыклапедыя «Беларуская ССР. Кароткая энцыклапедыя» і яе рускамоўны варыянт «Белорусская ССР. Краткая энцыклопедия», выдадзеныя ў Менску ў 1978–1982 гг.;

– А. Рогалев «Великое княжество Литовское: поиски исторических закономерностей» // «Крыжовы шлях. Дапаможнік для вывучаючых гісторыю Беларусі. Гістарычныя сшыткі. Сшытак першы». «Згода», – Мн., 1993;

– Саракавік І. А. «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. – Мн., «Современная школа», 2006.

Аднак паралельна з гэтым у другой палове XIX стагоддзя пра бітву ўжо ўзгадвюць С.М. Салаўёў і В.В. Турчыновіч.

Расейскі гісторык Сяргей Міхайлавіч Салаўёў у «Истории России с древнейших времен» піша: *«К 1362 или 1363 году относят победу Ольгерда над татарами при Синих водах, следствием которой было очищение Подолии от татар»* [35, 255]. Том выйшаў з друку ў шасцідзесятых гадах XIX стагоддзя.

Беларускі гісторык, краязнавец Восіп Вікенцьевіч Турчыновіч у выдадзенай у 1857 г. у Пецярбургу першай гісторыі Беларусі «Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен» прыводзіць словы рускага гісторыка Дзмітрыя Іванавіча Ілавайскага з «Истории России» пра гэтую падзею «*После Джанибека, когда наступил смутный период в Золотой Орде, Ольгерд начал действовать решительно. Он окончательно присоединил к своим владениям Киевское княжество и отдал Киев в удел одному из своих сыновей (Владимиру). В то же время он покорил земли между Бугом и Днепром. Северная часть этих земель принадлежала прежде галицко-волынским и называлась Понизье, а теперь сделалась известной под именем Подолье. Здесь собирали дани татарские баскаки и темники, властвовавшие в соседних днепровско-бугских степях. В Подолье было много селений и несколько городов (Бакота, Ушица, Каменец и др.), разоренные укрепления которых татары не позволяли возобновлять. Страна эта во время монгольского ига не подчинялась никакому русскому княжескому роду, а была разделена на мелкие волости. Во главе их были поставлены атаманы, которые между прочим занимались сбором дани для татар. И прежде соседние с Подольем татарские темники и князья нередко играли роль особых ханов благодаря своему отдаленному от Сарая положению, а теперь, во время неурядиц и раздробления Золотой Орды, они были предоставлены собственным силам. Ольгерд нередко вступал с ними в отдельные союзы и нанимал у них вспомогательные войска для походов на поляков и крестоносцев. Но так как это были ненадежные союзники, переходившие иногда на сторону его врагов, то великий князь литовский воспользовался помянутым смутным временем в Золотой Орде, когда заднепровские улусы не могли ожидать никакой помощи с Волги. Он начал с ними успешную войну. Одержал большую победу на Синих Водах (приток Буга) над тремя татарскими князьями Кутлубеем, Хаджикеем и каким-то, по-видимому, крещеным Дмитрием (около 1362 г.), а затем очистил от их господства всё Подолье и соседние южные степи между Днепром и Днестром до самого Черного моря. Остатки разбитой Орды удалились отчасти на нижний Дунай в Добруджу, а отчасти в Крым. Так легко обошлось ему покорение этой обширной страны. Подольскую область он предоставил в удел своим племянникам, сыновьям Кориата Гедиминовича. Первой их заботой была постройка крепких замков и возобновление старых городских укреплений, чтобы обезо-*

*пасить страну от будущих татарских нападений»* [40, 387–388].

Напрыканцы XIX стагоддзя (1882 г.) «Живописная Россия. Отечество наше... под общей редакцией П. П. Семёнова» паведамляе: *«В Подолии кочевали три орды Монголов. В 1362 г. Ольгерд одержал блистательную победу над тремя татарскими князьями: Вутлубугою, Хаджибеем и Дмитреем на берегах реки Синия-Воды. Затем проник в Тавриду и разрушил Херсонес, где захватил много сокровищ. Тогда же вся Подолия была присоединена к великому княжеству Литовскому, а вслед затем покорилось ему и Киевское княжество без боя»* [17, 79].

У сярэдзіне трыдцатых гадоў XX стагоддзя беларускі гісторык-славіст Уладзімір Іванавіч Пічэта у кнізе «Гісторыя Беларусі» піша: «*Скарыстаўшы з няладзіц у Ардзе, Альгерд задаў татарам вялікае паражэнне на Сініх Водах (1363), пасля якога ўсходняе Падолле было занята сынамі Карыята Гедзімінавіча»* [32, 109–110], а другі вядомы беларускі гісторык Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі ў «Кароткім нарыс гісторыі Беларусі» паведамляе: *«Яшчэ амаль што за 20 год да вядомай нам Кулікоўскай бітвы ў 1362 годзе Літоўска-Беларускае гаспадарства, злучыўшы ўсе свае сілы, вышла на спатканьне татар на пайдновую граніцу. Адбылося страшэннае збойства на Падолі. Ня гледзячы на вялікі лік і сваю храбрасць, татары былі разьбіты і, пакінуўшы многа трупаў, здабычы і палонных, уцяклі на пайдновы ўсход. Пад уплывам страху, татары доўга сюды не прыходзілі. І пайднёва-заходнія землі такім спосабам мелі цяпер магчымасць эканамічна і культурна разьвівацца,. забясьпечаныя ад пайдновага ворага»* [21, 79].

Далей упамінанне пра бітву сустракаем у «Истории СССР», выдадзенай у Кіеве ў сярэдзіне шасцідзесятых, знаходзім: *«Продвигаясь на юг, Альгерд встретился с татарами и разбил их на Синих Водах в 1362 г.»* [20, 257].

З 1969 года бітва трапляе ў энцыклапедычныя беларускія выданні – «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» т. 1 [3, 269] – і з таго часу згадваецца ў большасці беларускай гістарычнай літаратуры.

Цікава праслядзіць, як вызначаецца месца бітвы ў розных аўтараў.

Частка з іх упамінае бітву на Сініх Водах без вызначэння месца [6, 8, 9]. Многія пішуць на Сініх Водах, ля Сініх Водаў, не вызначаючы, што гэта: рака, возера, мясцовасць, паселішча і дзе размешчана. [4, 276; 5 117; 15, 6; 7, 87; 23, 161; 27, 118; 32, 109–110; 37, 61; 42, 15].

Частка аўтараў, у тым ліку і «Гісторыя Беларусі ў шасці тамах», выдадзеная ў 2008 г. у Мінску асцярожна паведамляе, што бітва адбылася на Сініх Водах (у сучаснай Украіне) [9, 65; 10, 287; 24 17].

Прызнаны сусветны гісторык Норман Дэвіс піша «У Синих Вод в излучине Днепра» [16, 287].

Пра тое, што «страшэннае збойства» адбылося на Падоллі, мы ўпаміналі [5].

На Сініх Водах ля Дняпроўскага лімана вызначаў месца бітвы вядомы беларускі гісторык, прафесар А. П. Грыцкевіч [13, 5].

Безумоўная большасць аўтараў лічаць, што Сінія Воды – гэта рака. Прычым усе лічаць, што гэта рака басейна Паўднёвага Буга [1, 32–33; 3, 269; 8, 52; 11, 82; 12, 30; 22, 86–87; 26, 37; 29, 117; 34, 72; 40, 387; 43, 211–219] і толькі частка канкрэтна называе Сінімі Водамі р. Сінюху [2, 71; 19, 54; 6; 31, 72; 31, 70–75; 36, 49; 44, 10–13; 45, 92–93]. Прычым прыхільнікі гэтую версію выказваюць як меркаванне, як В. Насевіч, ці лічаць, што р. Сінюха знаходзіцца на Падоллі, як В. Пасталіца.

Што можна сказаць у дадатак? Беларускія навукоўцы не займаліся пытаннем дакладнага вызначэння месца бітвы на Сініх Водах, аргументуючы:

– што бітва была па-за межамі сучаснай Беларусі;

– што у першакрыніцах месца не пазначана.

Сапраўды, у першакрыніцах дакладна не вызначана, дзе Сінія Воды. Узбуйнена мож-

на дакладна лічыць, што гэта *Падолле*. Прыхільнікі версіі р. Сінюха цытуюць <u>*польскага*</u> храніста Мацея Стрыйкоўскага, першага гісторыяграфа Вялікага Княства Літоўскага, які піша: »А гды пришли до Синей Воды, минувши Канев и Черкасы...» [33]. Тут трэба засяродзіць увагу на некалькіх момантах:

1. «Хроніка польская, літоўская, жмудская і ўсей Русі» напісана у канцы XVI стагоддзя (выдадзена ў 1582 г.) на матэрыялах хронік Генрыха Латвійскага, Альнпека, Кромера, Длугаша [41, 10]. М. Стрыйкоўскі – польскі гісторык, і «Хроніка» напісана ў інтарэсах Польшчы, якой было выгадна адсунуць далей на ўсход месца бітвы на Сініх Водах, каб пацвердзіць польскія правы на Валынь і Падолле.

2. Недахопам прац Я. Длугаша, польскага гісторыка XV ст., якімі карыстаўся М. Стрыйкоўскі, з'яўляецца путаніца ў храналогіі і генеалогіі вялікіх князеў Літоўскіх [18, 8].

3. Выраз «мінуўшы Канеў і Чаркасы» можна зразумець і як абмінуўшы, не заходзячы у гэтыя гарады.

4. У «Хроніцы» няма сведчання аб папярэднім заняцці Кіева войскамі ВКЛ, хоць многія навукоўцы лічаць Кіеў базай паходу Альгерда.

Пэўную яснасць можна знайсці, карыстаючыся звесткамі аб шляхах зносін у тыя часы. Як сведчаць археалагічныя даследванні беларускіх навукоўцаў, і Тураў [26, 71–78] і Мазыр [36, 49; 26, 37] мелі сталыя стасункі з Кіевам і Оўручам, пачынаючы з XII–XIII ст. Таму войскі ВКЛ лёгка маглі пераправіцца праз Прыпяць у Тураве і Мазыры і прама рухацца на Падолле праз Оўруч.

Я думаю, што ні ў кога няма сумненняў, што бітва была на *Падоллі*. Яшчэ адным доказам, што бітва была на Падоллі, і, калі казаць далей, на *Снівадзе*, трэба лічыць карту Вялікага княства Літоўскага, складзеную ў 1603 г Тадэушам Макоўскім па заказу і на грошы Мікалая Радзівіла. На ёй выразна бачны сучасны Хмельнік, які перайшоў Карыятавічам пасля перамогі над татарамі [38, 606]. Тое, што р. Снівада на гэтай карце не падпісана і дало магчымасці прыдумваць у пазнейшыя часы розныя версіі знаходжання месца бітвы.

Трэба ўлічваць і тое, што падзеі адбываліся ў другой палове XIV ст. Войска ВКЛ выбірала карацейшы шлях, каб менш сіл і сродкаў траціць на пераход. Вільня і Хмельнік знаходзяцца амаль на адным мередыяне і шлях ад Вільні да Снівады найкарацейшы менавіта праз Тураў, Оўруч. Гэты шлях ідзе ў осноўным міжрэччамі і не патрабуе пераправаў праз вялікія рэкі, акрамя Прыпяці.

Шлях на Сінюху ўздоўж Дняпра патрабуе пераправы праз буйную Рось, а ва ўмовах Дзікага Поля гэта вельмі праблематычна.

На маю думку, бітва адбылася на Снівадзе. Рэшткі татарскіх войскаў уцякалі з месца бітвы Чорным шляхам у напрамку Таргавіцы, дзе, верагодна, былі насцігнутыя войскамі ВКЛ. Ля Таргавіцы на р. Сінюха яны былі канчаткова разбіты. Таму асноўным месцам бітвы на Сініх Водах трэба лічыць р. Снівада, а р. Сінюха можа лічыццам месцам завяршэння разгрому татараў.

# СПАСЫЛКІ

1. 100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі. – Мн. : Навука і тэхніка, 1994.
2. Арлоў У., Сагановіч Г. Дзесяць вякоў беларускай гісторыі. 962-1918. 2-е выд. – Вільня : Наша будучыня, 2000.
3. Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. – Т.1. – Мн, 1969.
4. Беларуская энцыклапедыя ў 18 т. – Т. 1. – Мн. : Бел. Эн., 1996.
5. Беларусь Энцыклапедычны даведнік. – Мн. : Беларуская Энцыклапедыя, 1995.
6. Вялікае княства Літоўскае. Энцыклапедыя ў 2-х т. – Т. 1. – Мн. : Беларуская Энцыклапедыя, 2005.
7. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый. Вучэбны дапаможнік пад рэд. В. І. Галубовіча і Ю. М. Бохана. – Мн. : Экаперспектыва, 2005.
8. Гісторыя Беларусі ў шасці тамах. – Т. ІІ. Беларусь у перыяд Вялікага княства Літоўскага. – Мн. : Современная школа, 2008.
9. Гісторыя Беларусі. Дапаможнік для падрыхтоўкі да экзамену і цэнтралізаванаг тэсціравання / пад навук. Рэд. М. С. Сташкевіча, Г. Я. Галенчанкі, І. І. Багдановіча, 2-е выданне, перапрац. – Мн. : Аверсэв, 2006.
10. Гісторыя Беларусі. Дапаможнік для падрыхтоўкі да экзамену і цэнтралізаванага тэсціравання. Пад навук. рэд. М. С. Сташкевіча, Г. Я. Галенчанкі, І. І. Багдановіча. – Мн. : Аверсэв, 2005.
11. Голденков М. Утраченная Русь: забытая Литва, неизвестная Московия, запрещенная Беларусь – 3-е изд. – Мн. : Современная школа, 2010.
12. Голубеў В. Ф. і інш. Ці ведаеце вы гісторыю сваёй краіны? / 2-е выданне. – Мн. : Народная асвета, 1995.
13. Грицкевич А. П. Древний город на Случи. – Мн.: Полымя, 1985.
14. Гудавичюс Э. История Литвы с древнейших времён до 1569 г. – Т.1. – М., 2005.
15. Дзярновіч А. І. і інш. Лёс Крэва. – Мн. : Полымя, 1993.
16. Дэвис Норман. История Европы. – М. : Транзиткнига, 2004.
17. Живописная Россия. Отечество наше… под общей редакцией П. П. Семёнова. – Т.ІІІ. – Ч. І. – СПб.–М., 1882.
18. Заливако А. Историография генеалогии Беларуси (Х – XXI вв.). – СПб. : Невский простор, 2004.
19. Иллюстрированная хронология истории Беларуси. 2-е изд, допол. – Мн. : Беларуская энцыклапедыя, 2000.
20. История СССР. – Т. 2. – Киев, 1953–1954.
21. Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. – Мн. : Беларусь, 1992.
22. Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя. / Тэкст У. Арлова, Angloproekt corporation limited Neografia Martin. – Slovakia, 2003.
23. Кузнецов И. Н. Пособие по истории Беларуси. Повторительный курс. – Мн., 2004.
24. Лойка П. А. Поўны курс па гісторыі Беларусі ў датах і падзеях. – Мн. : Выдавецкі цэнтр БДУ, 2005.
25. Лысенко П. Ф. Сказание о Турове. – Мн. : Белорусская наука, 2006.
26. Матэрыялы па гісторыі Беларусі. Складальнік Н. С. Шарова. – Мн. : УП “Экаперспектыва”, 2000.
27. Мая радзіма – Беларусь. Падручнік для 4-га кл. Пад рэд. М. В. Біча і Э. А. Ляўкова. – Мн. : Народная асвета, 1996.
28. Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сёння. – Мн. : Навука і тэхніка, 1993.
29. Нарысы гісторыі Беларусі. – Ч.І. – Мн. : Беларусь, 1994.
30. Насевіч В.Л. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы, – Мн. : Полымя, 1993.
31. Пасталіца В. Бітва на Сініх Водах. Беларускі гістарычны часопіс. – № 3. – Мн., 1993.

32. Пічэта У. І. Гісторыя Беларусі. – Мн. : Выд. цэнтр БДУ, 2005.

33. Полное собрание русских летописей. – Т. 32. М., 1975.

34. Почекаев Р. Ю. Мамай. История “антигероя” в истории. – СПб. : ЕВРАЗИЯ, 2010.

35. Соловьев С. М. Сочинения. Книга II. История России с древнейших времен. – Т. 3–4. – Москва : Мысль, 1988.

36. Тарас А. Е. Войны Московской Руси с Великим княжеством Литовским и Речью Посполитой в XIV–XVII вв. – Мн. : Харвест, 2006.

37. Тарасаў К. Памяць пра легенды. Постаці беларускай мінуўшчыны. Выд. 2. дап. – Мн. : Полымя, 1994.

38. Труды Подольского Епархиального историко-статистического комитета. – Камянец-Подольский, 1901.

39. Трусаў А. А., Здановіч Н. І. Новае пра старажытны Мазыр (па матэрыялах археалагічных даследванняў 1981 – 1984 гг.). Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі: Новыя матэрыялы і даследванні / Пад рэд. В. М. Ляўко. – Мн. : Навука і тэхніка, 1993.

40. Турчинович И. В. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен. – СПб, 1857. репринтное издание. – Мн. : Бел. Эн., 2006.

41. Улащик Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. – М., 1985.

42. Храналогія гісторыі Беларусі. 3-е выданне. – Мн. : Беларуская энцыклапедыя, 1992.

43. Цвірка Кастусь. Край легенд. Гісторыя Беларусі паводле паданняў і легендаў. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2004.

44. Чарняўскі М. Дзесяць бітваў. – Вільня : Наша будучыня, 2004.

45. Чигринов П. Г. История Беларуси с древности до наших дней. Учебное пособие. – Мн. : Книжный Дом, 2004.